УДК 821.161.3.09

# Пісьменнік у мастацкім асэнсаванні Максіма Багдановіча

**Белавус Н.П.**

***Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Віцебск***

*Максім Багдановіч – класік беларускай літаратуры, шматмерны ў эстэтычным плане і стылёва разнастайны творца. Адным з першых паэт узбагачаў нацыянальную літаратуру новымі для яе вершаванымі формамі і тэмамі, перакладаў на беларускую мову творы класікаў сусветнай літаратуры, у тым ліку рускай і ўкраінскай. Узаемадачыненні мастацкай асобы і рэальнага жыцця, лёс паэта ў свеце, тэма творчага натхнення былі цэнтральнымі ў яго літаратурнай і літаратуразнаўчай спадчынах.*

*Мэта артыкула – раскрыць вобраз пісьменніка ў мастацкім асэнсаванні Максіма Багдановіча.*

***Матэрыял і метады.*** *Матэрыял даследавання – вершы, апавяданні і літаратурна-крытычныя артыкулы Максіма Багдановіча. У працы выкарыстаны прыёмы дэскрыптыўнага, кампаратыўнага і канкрэтна-гістарычнага метадаў.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *У артыкуле разглядаюцца эстэтычныя погляды Максіма Багдановіча, што знайшлі яркае, канцэптуальнае ўвасабленне ў прозе, літаратурна-крытычных артыкулах і найбольш поўна – у паэзіі. Адна з галоўных ідэй, выказаных творцам, – грамадская місія мастака і асветніцкае прызначэнне мастацтва ў грамадстве. М. Багдановіч заклікаў майстроў слова шмат і дасканала працаваць над радкамі сваіх вершаў. Згодна з канцэпцыяй класіка творчая спадчына сапраўды таленавітага аўтара – аснова для развіцця творчасці паслядоўнікаў і фарміравання шырокай літаратурнай плыні. Самаахвяраванне дзеля інтарэсаў народа было вышэйшай ступенню праяўлення грамадскай пазіцыі паэта. Сваёй галоўнай эстэтычнай задачай М. Багдановіч бачыў пашырэнне тэм і мастацкіх форм роднай літаратуры, арыентацыю яе на эстэтычную бездакорнасць, канцэптуальную і стылёвую ўнікальнасць. У сваіх вершах пісьменнік часта разважае над праблемамі ўласнай творчасці і шляхамі развіцця мастацтва.*

***Заключэнне.*** *Максім Багдановіч у сваёй творчасці дасягаў дасканаласці форм, а літаратурную дзейнасць скіраваў у рэчышча спасціжэння ўласнай індывідуальнасці і мастацкага асэнсавання асобы творцы. Паэт, у трактоўцы М. Багдановіча, – майстар, творчая асоба з добрым мастацкім густам і патрыятычнымі памкненнямі.*

***Ключавыя словы:*** *Максім Багдановіч, творца, вобраз пісьменніка, мастацкае асэнсаванне, форма твора, мастацкая творчасць.*

*(Ученые записки. – 2016. – Том 21. – С. 200–203)*

# Writer in the Artistic Interpretation by Maxim Bogdanovich

**Belous N.P.**

***Educational Establishment “Vitebsk State P.M. Masherov University”, Vitebsk***

*Maxim Bogdanovich is a classical author of Belarusian literature, a multidimensional aesthetically and stylistically diverse creator. He was one of the first who enriched the national literature with new poetic forms and themes and with the works of world literature translated into Belarusian, including Russian and Ukrainian works. Relationship between the artistic personality and the real life, the fate of the poet in the world, inspiration were the central themes of his literary heritage.*

*The purpose of the article is to reveal the image of the writer in the artistic interpretation by Maxim Bogdanovich.*

***Material and methods.*** *Research objects are the poems, short stories and literary-critical articles by Maxim Bogdanovich. We used descriptive, comparative and concretely historical methods.*

***Findings and their discussion.*** *This article deals with the aesthetic views of Maxim Bogdanovich, which found bright and conceptual expression in prose, literary-critical articles and mostly in the poetry. One of the main ideas expressed by the author is the artist’s public mission and the educational purpose of art in society. M. Bogdanovich called the masters of the word to work a lot and thoroughly on lines of their poems. According to M. Bogdanovich’s concept the creative heritage of really talented authors is the basis for the development of creativity and the formation of literary trends. Self-sacrifice for the sake of the interests of the people was the highest degree of manifestation of the poet’s social position. M. Bogdanovich supposed that his main aesthetic purpose was the expansion of themes and artistic forms of the native literature, its focus on the aesthetic perfection, conceptual and stylistic uniqueness. In his poems the writer often reflected on the problems of the creativity and ways of art’s development.*

***Conclusion.*** *Maxim Bogdanovich reached perfection of forms, and channeled his literary activities into comprehension of own individuality and artistic interpretation of the personality of the creator. M. Bogdanovich supposed a poet to be a master, creative person with a good artistic taste and patriotic aspirations.*

***Key words:*** *Maxim Bogdanovich, creator, the image of the writer, artistic interpretation, the shape of the work, artistic creation.*

*(Scientific notes. – 2016. – Vol. 21. – P. 200–203)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* natasha_belous2803@mail.ru – **Н.П. Белавус**

Максім Багдановіч – класік беларускай літаратуры, шматмерны ў эстэтычным плане і стылёва разнастайны творца. Паводле ацэнкі літаратуразнаўцы Т.І. Вабішчэвіч, "Максім Багдановіч стаў, па сутнасці, першым з беларускіх аўтараў, хто падышоў да мастацкай творчасці мэтанакіравана і сістэмна – як і належыць творцу-прафесіяналу" [1, с. 105]. Адным з першых паэт узбагачаў нацыянальную літаратуру новымі для яе вершаванымі формамі і тэмамі, перакладаў на беларускую мову творы класікаў сусветнай літаратуры, у тым ліку рускай і ўкраінскай. Апавяданні Максіма Багдановіча, як сцвярджае літаратуразнавец Т.М. Кароткая, "ляжаць ля вытокаў нацыянальнай прозы, а яго крытычныя даследаванні шмат у чым прадвызначылі развіццё літаратурнай крытыкі, сталі фундаментальнай асновай у вывучэнні гісторыі літаратуры" [2, с. 159]. Роля і значэнне Максіма Багдановіча ў развіцці беларускага прыгожага пісьменства, у нацыянальным і духоўным адраджэнні беларусаў высока ацэнена нашчадкамі. Творчую спадчыну класіка вывучае адна з галін беларускай літаратурнай навукі – багдановічазнаўства. Узаемадачыненні мастацкай асобы і рэальнага жыцця, лёс паэта ў свеце, тэма творчага натхнення былі цэнтральнымі ў яго літаратурнай і літаратуразнаўчай спадчынах.

Мэта артыкула – раскрыць вобраз пісьменніка ў мастацкім асэнсаванні Максіма Багдановіча.

**Матэрыял і метады.** Матэрыял даследавання – вершы, апавяданні і літаратурна-крытычныя артыкулы Максіма Багдановіча. У працы выкарыстаны прыёмы дэскрыптыўнага, кампаратыўнага і канкрэтна-гістарычнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Для безнадзейна хворага паэта Максіма Багдановіча творчасць была не проста жыватворнай крыніцай, а цэлым жыццём, таму эстэтычныя погляды М. Багдановіча знайшлі яркае, канцэптуальнае ўвасабленне і ў прозе, і ў літаратурна-крытычных артыкулах, але найбольш поўна – у паэзіі. Адна з галоўных выказаных ідэй творцам – грамадская місія мастака і асветніцкае прызначэнне мастацтва ў грамадстве. Верш **"Песняру"** – яскравы адказ на пытанне аб адказнасці паэта перад чытачом. М. Багдановіч заклікаў майстроў слова шмат і дасканала працаваць над радкамі сваіх вершаў. Творчы працэс Максім Багдановіч параўноўвае з апрацоўкай каменя, што намаганнямі майстра ператвараецца ў мастацкую каштоўнасць: *"Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш, / Абрабіць яго трэба з цярпеннем. / Як ударыш ты ім, – ён, як звон, зазвініць, / Брызнуць іскры з халодных каменняў"* [3, т. 1, с. 126]. У другім жа вершы з нізкі "Думы" паэт назірае прыроднае ператварэнне з натуральнага ў эстэтычнае – нараджэнне жамчужыны з пясчынкі. Падобна да метамарфозаў прыроды *"кавалак грубага жыцця"* можа ператварыцца ва ўзвышаны парыў душы паэта: ***"Калі ў ракавіну цёмную жамчужніцы*** */ Упадзе пясчынка хоць адна, – / Жомчугам патроху робіцца яна! / Калі ў дух мой западзе і заварушыцца / Там кавалак грубага жыцця, – / Ў жомчуг звернецца ён сілай пачуцця!"* [3, т. 1, с. 124]. У вершы **"Гутарка з паненкамі"** зноў бачацца варыяцыі матыву аб ператварэнні грубага матэрыялу ў прыгожыя формы: *"Вельмі шаноўныя паненкі! / Тут ёсць напэўна трохі цуду: / Ў гняздзечку міленькім і сценкі / І дно яна зляпіла з бруду"* [3, т. 1, с. 128].

У артыкуле-аглядзе **"Глыбы і слаі"** Максім Багдановіч пісаў: *"Усякі выясніўшыйся, абасобніўшыйся пісьменнік хоць бы раз праз адно гэта стаіць на крок упераздзе пісьменнікаў-аднаднёвак, вабіць іх сваёй яркасцю, як аганёк матылькоў, і, прывабіўшы, гартуе вакол сябе, творыць літаратурны кірунак"* [3, т. 2, с. 185]. У прыведзеным выказванні класіка апісваецца механізм узбагачэння літаратуры новымі ідэямі, формамі і літаратурнымі элементамі. Згодна з канцэпцыяй М. Багдановіча, творчая спадчына сапраўды таленавітага аўтара – аснова для развіцця творчасці паслядоўнікаў і фарміравання шырокай літаратурнай плыні. Беларускі пісьменнік, развіваючы матыў стварэння твора, абыгрываў багатую вобразнасць паэтычнага радка. Кожны з вершаў па-рознаму раскрывае тэму творчасці, але пра вечную каштоўнасць сапраўднага мастацтва і майстэрства паэта Багдановіч найперш па-філасофску разважае ў наступных радках: ***"Ціхія мае ўсе песні, цёмныя, як вугаль чорны****, / Але ўсё ж яны засвецяць, калі я ў агні мучэння / Іх разжару, распалю; / А як згасне ён – дык бліснуць, быццам дыяментаў зёрны, / Бо абернуцца, застыўшы, у драгацэнныя каменні / Ў час, як лягу я ў зямлю"* [3, т. 1, с. 233].

У М. Багдановіча шмат вершаў напісана ў палітычных ўмовах, калі беларускую літаратуру прымушалі адступіцца ад ідэалаў свабоды. Самаахвяраванне дзеля інтарэсаў народа было вышэйшай ступенню праяўлення грамадскай пазіцыі паэта. У санеце **"Замёрзла ноччу шпаркая крыніца"** Багдановіч разважае пра непарыўныя сувязі паэта з вонкавым светам, з сацыяльнымі абставінамі, якія непазбежна ўцягваюць творчую асобу ў сітуацыю грамадскага супрацьстаяння. Вершы паэта нараджаліся з мэтай выказаць шчырую адданасць народу. Яны былі звязаны з радзімай, жыццём і барацьбой. Максім Багдановіч сімвалічна параўноўвае лёс свайго народа і лёс

паэта з крыніцай, што замёрзла зімой. На яе паверхні *"няма ўжо руху ні сляда"*, але ўнутры, пад слоем снега, *"струіцца магутная, жывучая вада"*, што здолее *"на вольны свет прабіцца"*: *"Прыклаў я гэты сімвал да сябе, / Схіліўшыся ў надсільнай барацьбе, / І разгадаў прыроды роднай словы. / Як – прамаўчу, бо кожны з вас – паэт. / Рассейце ж самі лёгкі змрок прамовы, / Сваей душы туды праллiце свет!"* [3, т. 1, с. 248]. Вялікую ролю ў фарміраванні духоўнасці народа М. Багдановіч ускладаў на песняроў, майстроў мастацкага слова. Ён падкрэсліваў, што дапамагчы свайму народу зможа толькі той творца, які не толькі клапоціцца пра тэхніку свайго верша, але і ўсяго сябе без астатку аддае людзям.

Максім Багдановіч патрабаваў ад паэта перш за ўсё шчырасці пачуццяў, непасрэднасці, глыбіні думак, а ўжо затым – дасканалай тэхнічнай апрацоўкі верша. *"Порою хорошо и безыскусственное искусство, и лучше уж примитивность, чем вычурность"*, – заўважае ён у нататцы аб творчасці рускага сялянскага паэта І. Марозава [3, т. 2, с. 413].

З цяжкім каменем на сэрцы пісаў Максім Багдановіч пра тое, што ў "нашай беднай старане" нялёгка быць паэтам, бо сапраўдны творца акумулюе ў сабе гора і пакуты суайчыннікаў. Аднак сам верш, як песня душы, узнікае з жадання служыць свайму народу. Радкі з'яўляюцца на паперы з адчування грамадскага абавязку паэта. Як доказ – верш **"Мае песні"**: *"А як родную згадаю старану, / Як згадаю яе беднасць і нуду, – / Сэрца сціснецца, і я пяяць пачну..."* [3, т. 1, с. 199]. Паколькі ў паўсядзённым жыцці шмат адмоўнага, неідэальнага і недасканалага, паэт павінен шукаць і знаходзіць у творчым працэсе моцныя сродкі для змагання са злом: ***"Я думы, путамі не скутыя,*** */ Тут перад вамі вываджу, / Я проці ганення кажу: / Хваробы лечаць і атрутамі"* [3, т. 1, с. 127]. Непрыхаваную, відавочную іронію, накіраваную на тых, хто лічыць момант паэтычнага натхнення і сам акт творчасці ў цэлым вынікам нябеснага бласлаўлення, бачым у наступных радках паэта: ***"Вы кажаце мне, што душа ў паэта,*** */ Калі спараджае ён дзіўныя вершы, / Нябесным агнём абагрэта, / І ў час той між люду ён – першы... / Ах, дзякуй на гэтай прамове; / Душа мая, пэўна, шчаслівай была бы, / Калі б я не ведаў, панове, / Што пекна спяваюць і жабы"* [3, т. 1, с. 129].

Сваёй галоўнай эстэтычнай задачай М. Багдановіч бачыў пашырэнне тэм і мастацкіх форм роднай літаратуры, арыентацыю яе на эстэтычную бездакорнасць, канцэптуальную і стылёвую ўнікальнасць. У вершы **"Тэрцыны"** паэт дакладна вызначыў уласную пазіцыю ў дачыненні да праблемы творчай пераемнасці: *"Ёсць чары ў забытым, старадаўным; / Прыемна нам сталеццяў пыл страхнуць / І жыць мінулым – гэткім мудрым, слаўным, – / Мы любім час далёкі ўспамянуць. / Мы сквапна цягнемся к старым паэтам, / Каб хоць душой у прошлым патануць. / Таму вярнуўся я к рандо, санэтам, / І бліснуў ярка верш пануры мой: / Як месяц зіхаціць адбітым светам, – / Так вершы ззяюць даўняю красой!"* [3, т. 1, с. 143].

Узгадваючы славутых старажытных паэтаў і аналізуючы іх набыткі, М. Багдановіч у сваіх вершах часта разважае над праблемамі ўласнай творчасці і шляхамі развіцця мастацтва. У вершы **"Бледны, хілы, ўсё ж люблю я..."** паэт апявае *"мудры і кіпучы верш"* старажытнагрэчаскага творцы Анакрэонта, што *"ў жылах кроў хвалюе, / Ў ім жыццё струёю плешча, вее хмелем ён"* [3, т. 1, с. 120]. Не толькі прызнанне і прыхільнасць да такога роду паэзіі – лёгкай, жыццярадаснай – меркаваў выказаць беларускі аўтар. Вядома, выпрабаванне часам праходзіць кожны радок паэта. Толькі сапраўдная паэзія, паводле М. Багдановіча, нагадвае вытрыманае віно: *"Дні ідуць, праходзяць годы, – / Але ўсё крапчэй, хмяльнее робіцца яно"* [3, т. 1, с. 120].

Істотным для разумення пазіцыі Максіма Багдановіча адносна творчасці і паказальным у плане звароту да антычнасці з'яўляецца верш **"Ліст да п. В. Ластоўскага"**. Паэт, асэнсоўваючы на вобразах Моцарта і Сальеры сутнасць творчай дзейнасці мастака, надаў гэтаму пытанню палемічную вастрыню. Суадносячы важкасць таленту, працы і натхнення ў мастацкай дзейнасці, разважаючы над творчымі здабыткамі, Багдановіч невыпадкова акцэнтуе ўвагу на сальерыеўскім тыпе творчасці. Канстатаванае беларускім песняром *"У творчасці яго раптоўнага няма: / Аснова да яе – спакойная дума"* [3, т. 1, с. 264] выразна супадае з яго ўласнай творчай пазіцыяй. Відаць, таму Сальеры ў згаданым вершы творцы і атрымлівае пісьменніцкае апраўданне. М. Багдановіч аргументавана даказвае, што праца, *"мерны, нудны труд"* не пашкодзіць развіццю таленту: *"Не! Працай гэтаю сябе ён развіваў. / ... / Хай судны час настане, – / Спакойна Музе ён і проста ў вочы гляне, / І будзе за любоў да здольнасці сваёй / Апраўдан Музаю і ўласнаю душой"* [3, т. 1, с. 264].

"Творчасць Багдановіча няспынна хвалюе нас, радуе і вучыць. Беларуская паэзія многім яму абавязана. Вось ужо каторае дзясяцігоддзе творчасць яго з'яўляецца неадлучным спадарожнікам у нашым жыцці, актыўна ўздзейнічаючы на фарміраванне этычных і эстэтычных поглядаў новых і новых пакаленняў чытачоў..." [4, с. 148], – адзначаў М. Танк.

Паводле высновы М. Багдановіча, форма твора – гэта "арганічная, неад'емная частка

яго сутнасці, важнейшая праява мастацкасці". Менавіта таму, на яго думку, "краса формы – адзіная мера каштоўнасці мастацкага твора". Не толькі ў вершаваных радках, але і ў "**Апавяданні аб іконніку і залатару**, людзях мудрых і красамоўных, кнігалюбцам нейкім дзеля славы Божай ды размнажэння дабра паспалітага выкладзенае" Багдановіч закранаў тэму мастацкай творчасці. Гэту цудоўную гістарычную стылізацыю трэба вылучыць асобна, бо ў ёй вырашаецца пэўная эстэтычная праблема. Пісьменнік недвухсэнсоўна падкрэслівае: *"Прызнаць мы мусім, што каштоўнасць вырабаў прыгожых адно толькі праз красу іх форм узрастае і толькі красою форм каштоўнасць тую мераць можна"* [3, т. 2, с. 63]. Багдановіч быццам бы схільны пагадзіцца з высновай залатара. Ён паказаў значнасць для творчасці руплівай працы, без якой немагчыма нараджэнне прыгожых форм. Паэт абараняў не шаблоны або паўторы, а неабходнасць наватарства, разуменне таго, што мастацтва аднаўляецца толькі ў пошуку, у руху наперад. Ад вытанчанасці форм, якіх дасягае майстар, залежаць прыгажосць і мастацкая вартасць твораў. З другога боку, крытэрыем майстэрства з'яўляецца ўменне майстра дасягнуць дасканаласці формы мастацкіх рэчаў: *"Бо чым болей ад работы майстра формы рэчы прыгажосці набіраюць, тым каштоўнейшай рэч гэтая пачынае рабіцца. Таксама і здольнасць майстра тым большай трэба ўважыць, чым лепшую форму кавалку срэбра або золата прыдаць ён здольны"* [3, т. 2, с. 63].

Пэўнае проціпастаўленне хараства матэрыяльнаму боку жыцця, разліку, карыснасці, утылітарнасці нельга не заўважыць у апавяданні **"Апокрыф"**. Самой формай апавядання падкрэсліваецца думка аб універсальным, вышэйшым, быццам культавым значэнні творчасці і хараства. Але фрагментарнасць выказванняў сведчыць аб тым, што Багдановіч толькі пачынаў свой шлях да разумення сутнасці мастацкай творчасці. "Апокрыф" і "Апавяданне аб іконніку і залатару..." – гэта тэматычна і стылёва звязаныя творы. Абодва прысвечаны тэме мастацтва і стылізуюць тагачасную беларускую мову пад скарынінскія прадмовы і пасляслоўі да Біблії. У апошнім і заключалася наватарства Багдановічавай прозы, хоць не толькі ён першы ўводзіў прытчавую форму ў тагачасную беларускую літаратуру.

У невялікай крытычнай самахарактарыстыцы, якую сустракаем у аглядзе **"Глыбы і слаі"**, Максім Багдановіч зазначае, што *"асобнасці яго таленту выступаюць ужо даволі ясна"* [3, т. 2, с. 190]. Аб'ектыўныя ацэнкі сваёй лірыкі дае паэт і ў іншых крытычных працах. У артыкуле **"За тры гады: агляд беларускай краснай пісьменнасці 1911–1913 гг."** аўтар адзначае: *"М. Багдановіч таксама дбаў аб развіцці верша і даў колькі «нанізак» іх (цыклаў), новых або па тэмах, або па форме"* [3, т. 2, с. 225]. А ў **"Белорусском возрождении"** чытаем *"...моё творчество было направлено главным образом на расширение круга тем и форм белорусской поэзии"* [3, т. 2, с. 281]. Такі глыбокі, прадуманы самааналіз дае падставы сцвярджаць, што Багдановіч-паэт падпарадкоўваў кожны свой верш законам мастацкай рацыянальнасці. Узгадваючы словы класіка, *"... у творчасці ўсё хацеў паняць, / Ва ўсім упэўніцца, усё абмеркаваць, / Абдумаць спосабы, і матэр'ял, і мэту"* [3, т. 1, с. 263].

Максім Багдановіч – паэт-лірык, празаік, тонкі крытык з высокім разуменнем і адчуваннем сусветных мастацкіх набыткаў – евангельскіх прыпавесцяў, хрысціянскіх апокрыфаў, старажытнай і антычнай літаратуры, прыгожага пісьменства розных народаў. Глыбокая, самаахвярная любоў да беларускай мовы і роднага краю не зрабіла з яго абмежаванага ў нацыянальным плане чалавека. Менавіта ў гэтым "прыкмета геніяльнасці – узняцца высока, каб святлом твораў сваіх дапамагчы свайму народу, а разам з ім і ўсім людзям ісці «праз церні да зорак», як казаў Людвіг ван Бетховен" [5, с. 263].

**Заключэнне.** Максім Багдановіч у сваёй творчасці дасягаў дасканаласці формаў, а літаратурную дзейнасць скіраваў у рэчышча спасціжэння ўласнай індывідуальнасці і мастацкага асэнсавання асобы творцы. Паэт, у трактоўцы М. Багдановіча, – майстар, творчая асоба з добрым мастацкім густам і патрыятычнымі памкненнямі.

## Літаратура

1. Вабішчэвіч, Т.І. Літаратурная традыцыя Максіма Багдановіча як ідэйна-эстэтычная праграма / Т.І. Вабішчэвіч // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2005. – № 4. – Ч. 1. – С. 105–109.
2. Кароткая, Т.М. Багдановіч Максім / Т.М. Кароткая // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі. – Т. 1: Абуховіч–Ватацы. – С. 157–178.
3. Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991–1995.
4. Бачыла, А. Дарогамі Максіма Багдановіча / А. Бачыла. – Мінск: Нар. асвета, 1983. – 104 с.
5. У бязмежную даль: кніга пра Максіма Багдановіча: да 105-й гадавіны з дня нараджэння / уклад. С.С. Панізнік. – Мінск: Нар. асвета, 1996. – 432 с.

*Паступіў у рэдакцыю 05.05.2016 г.*